*УДК 930(47+57):321.011(476):327.5(438+(47+57))"1919-1920"*

**М.М. Мязга**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны

## БЕЛАРУСКАЕ ПЫТАННЕ ПАД ЧАС ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ 1919–1920 ГГ. У САВЕЦКАЙ МІЖВАЕННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ[1]

*У артыкуле раскрыты змест савецкай міжваеннай гістарыяграфіі, якая займалася вывучэннем беларускага пытання ў сувязі з падзеямі польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. Выяўлены тыя аспекты гэтага пытання, якія аказаліся ў цэнтры ўвагі даследчыкаў, устаноўленыя і ахарактарызаваныя распрацаваныя імі канцэпцыі.*

Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг. аказала велізарны ўплыў на лёс беларускага народа. Яна стала падзеяй, якая ў рашаючай ступені вызначыла характар савецка-польскіх адносін на ўвесь міжваенны перыяд. Гістарычная значымасць польска-савецкай вайны выклікала вялікую цікавасць да гэтай падзеі савецкай гістарыяграфіі ўжо ў міжваенны час. У тым ліку па-за яе ўвагай не засталіся і падзеі вайны, якія ўплывалі на лёс Беларусі.

Савецкая гістарыяграфія, па-першае, закранула беларускае пытанне пры вывучэнні прычын і аспектаў польскай экспансіі ва ўсходнім напрамку, у тым ліку і на беларускія землі. У. І. Ленін адзначыў, што Польшчу да такой палітыкі штурхала “старая векавая барацьба” супраць Расіі [1, с. 18, 19]. Даследчыкі М. Е. Какурын і В. А. Мельнікаў акцэнтуюць увагу на польскую экспансію ва ўсходнім напрамку з мэтай аслаблення Расіі. Для гэтага Ю. Пілсудскі імкнуўся адарваць ад яе заходнія ўскраіны, у тым ліку і Беларусь, і стварыць з імі федэрацыю [2, с. 6–8]. Я. Іофе абгрунтоўвае тэзіс аб планах “польскай буржуазіі” стварыць “вялікую Польшчу ад мора да мора” з уключэннем у яе склад “Літвы, Беларусі і ўсёй Правабярэжнай Украіны” [3, с. 146, 152]. К. Радэк адзначаў, што Ю. Пілсудскі не давяраў Савецкай Расіі, і з-за гэтага нараджаецца яго план стварэння ланцуга буферных дзяржаў паміж ёй і Польшчай. У той жа час нацыянальная дэмакратыя хацела далучыць да Польшчы тыя часткі Заходняй Беларусі і Літвы, на якіх мелася значная колькасць каталіцкага насельніцтва [4, с. 17]. Такім чынам, савецкая гістарыяграфія міжваеннага часу вызначыла Беларусь як адзін з аб’ектаў польскай экспансіі.

Разглядаючы польскія планы захопу зямель на ўсходзе, савецкая гістарыяграфія адзначала імкненне польскай палітыкі аднавіць “панаванне памешчыкаў” на землях Украіны, Літвы і Беларусі. К. Радэк яшчэ ў час вайны пісаў на гэты конт: “Зыходным пунктам палітыкі польскага ўрада ў адносінах да Расіі з’яўляецца жаданне вырваць з рук сялян, якіх вызваліла руская рэвалюцыя, землі і вярнуць іх буйным польскім памешчыкам” [5, с. 6]. У 1930-я гг. тэзіс аб эканамічных інтарэсах польскай буржуазіі і

[1] Статья подготовлена в ходе выполнения задания в рамках программы «Экономика и гуманитарное развитие белорусского общества», подпрограмма «История и культура».

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

памешчыкаў як прычыне польскай экспансіі на беларускія землі атрымаў далейшае развіццѐ. П. В. Суслаў пісаў аб інтарэсах польскіх памешчыкаў, якія да рэвалюцыі валодалі ¾ усіх буйных маѐнткаў [6, с. 19]. Як бачна, класавы аспект пры даследаванні польскай усходняй палітыкі небезпадстаўна выходзіць для савецкіх гісторыкаў на першы план. Тэзіс аб імкненні польскіх памешчыкаў вярнуць свае маѐнткі знаходзіць пацверджанне і ў дакументах. Так, член польскай дэлегацыі на Парыжскай канферэнцыі Е. Ромер заўважаў, што некаторыя яе прадстаўнікі пры вызначэнні ўсходняй граніцы Польшчы кіраваліся імкненнем вярнуць сваю ўласнасць [7, с. 11].

Савецкая гістарыяграфія закранае беларускае пытанне ў кантэксце вызвалення Чырвонай Арміяй беларускіх працоўных. І. Ф. Лочмель пісаў у гэтай сувязі: “У асобе наступаўшай Чырвонай Арміі беларускі народ меў брацкую дапамогу вялікага рускага народа, з якім беларускі народ на працягу сваѐй гісторыі быў звязаны кроўнымі вузамі братэрства і садружнасці” [8, с. 43]. Са свайго боку, Д. Дудкоў адзначаў: “Рабочыя і сяляне Беларусі пры дапамозе Чырвонай арміі і ўсяго рускага пралетарыята сапраўды хутка пакончылі як з акупантамі, так і з іх памагатымі – нацдэмамі”. Пры ацэнцы ролі рускага народа ў вызваленні беларусаў ѐн спасылаецца на заяву І. В. Сталіна, які казаў, што ў нацыянальных рэспублік ѐсць два шляхі: разам з Расіяй, і тады вызваленне ад імперыялістычнага гнѐта, ці разам з Антантай, і тады немінучае імперыялістычнае ярмо [9, с. 124, 126]. Як бачна, гаворка ідзе аб ролі рускага народа і рускага пралетарыята ў вызваленні Беларусі. Тут выразна праяўляецца палітычны фактар. У 1930-я гады сталінскае кіраўніцтва ў многім вяртаецца да расійскай імперскай палітыкі. У сувязі з гэтым у гістарычнай навуцы шырокае распаўсюджванне атрымоўвае тэзіс аб гістарычнай ролі рускага народа як стваральніка вялікай рускай дзяржавы, на аснове якой сфарміраваўся СССР.

Інтарэсы Беларусі непасрэдна закранала пытанне тэрытарыяльных саступак з боку Савецкай Расіі на карысць Польшчы. К. Радэк адзначаў, што савецкі бок, каб дасягнуць мірнага ўрэгулявання з Польшчай, ужо ў канцы 1919 – пачатку 1920 г. гатовы быў пайсці на вялікія тэрытарыяльныя саступкі. Тлумачачы прычыны гэтай гатоўнасці, К. Радэк пісаў: “Гэта мы рабілі таму, што ведалі, што ў Польшчы нарастае рэвалюцыя рабочых, што ў Польшчы, магчыма праз паўгода ці год рабочыя возьмуць уладу, вызваляць сялян Літвы і Беларусі” [5, с. 17]. Ю. Мархлеўскі далучэнне беларускіх зямель да Польшчы разглядаў як фактар, які павінен паспрыяць рэвалюцыі, таму што панаванне польскіх памешчыкаў прывядзе да рэвалюцыянізацыі беларускага сялянства [10, с. 13]. Савецкая гістарыяграфія справядліва адзначыла малую значымасць для савецкага кіраўніцтва пытання аб граніцах з Польшчай у сувязі са спадзяваннямі на хуткую сусветную рэвалюцыю.

Савецкія даследчыкі звярнуліся да праблемы беларускага нацыянальнага руху ў час вайны толькі 1930-я гг. У пачатку гэтага дзесяцігоддзя разгортваецца кампанія супраць “нацдэмаў”. У рабоце П. Суслава, якая была выдадзена ў 1930 г., яшчэ не прыпісвалася адназначна дзеячам беларускага нацыянальнага руху “здрадніцкае супрацоўніцтва” з Польшчай. Аўтар адзначаў актыўныя пратэсты беларускіх нацыянальных арганізацый супраць уключэння Беларусі ў склад польскай дзяржавы з прадастаўленнем ѐй самакіравання. Яны патрабавалі поўнай незалежнасці для Беларускай Рэспублікі. У той жа час ѐн адзначаў, што Ю. Пілсудскі ў 1920 г. змог стварыць сваю агентуру ў Беларусі [6, с. 16, 17]. У тым жа годзе ў часопісе “Маладняк” быў надрукаваны артыкул З. Жалуновіча, у якім дзеячы беларускага нацыянальнага руху ўжо адназначана прадстаўляюцца як марыянеткі Пілсудскага [11, с. 63].

У 1930-я гг. у савецкай гістарыяграфіі з’яўляецца цэлая серыя работ, аўтары якіх ацэніваюць палітыку беларускіх нацыяналістаў у час польска-савецкай вайны як, безумоўна, здрадніцкую. В. К. Шчарбакоў абвінавачваў беларускіх нацыянал-дэмакратаў у імкненні аб’яднаць Беларусь з Польшчай на федэралісцкай аснове, у тым, што яны “ішлі побач з польскай контррэвалюцыяй, актыўна дапамагаючы ѐй у справе барацьбы з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

працоўнымі Беларусі”. Але пры гэтым ѐн звярнуў увагу, што сярод беларускіх нацыянальных дзеячаў знайшліся і тыя, хто не падтрымаў заклікі Пілсудскага ісці “вызваляць застаўшуюся частку Беларусі”, у выніку чаго адбыўся раскол рады БНР 13 снежня 1919 г. [12, с. 101–102]. Д. Дудкоў наступным чынам ацэньваў узаемадзеянне беларускіх нацыянальных дзеячаў і польскіх улад: “Белапольскія акупанты … знайшлі ў асобе беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія не ігнаравалі ніякай подлай і гразнай контррэвалюцыйнай работай”, сваіх надзейных памочнікаў. Па яго словах, “пасля ўрачыстай сустрэчы Пілсудскага, беларускія нацыянал-дэмакраты разгарнулі ў сваім друку прапаганду за захоп белапалякамі ўсёй Беларусі». Была пачата работа па стварэнню “беларускага войска” разам з акупантамі [9, с. 118, 119]. У сваіх ацэнках беларускага нацыянальнага руху Д. Дудкоў зыходзіць са сталінскай ацэнкі, згодна якой барацьба нацыянальных урадаў на ўскраінах Расіі была барацьбой буржуазнай контррэвалюцыі супраць сацыялізму [9, с. 127]. У даследаваннях І. Ф. Лочмеля гучала абвінавачванне “контррэвалюцыйнай Беларускай Рады з памешчыкаў і буржуазіі” ў дапамозе польскім акупантам, якія “толькі для падману мас прыкрываліся фальшывым беларускім нацыянальным сцягам». Урад БНР на чале з Ластоўскім характарызаваўся як марыянетачны, “які прысмыкаецца перад сваімі польскімі гаспадарамі”. [8, с. 28, 29, 31]. І. Ф. Лочмель таксама адзначаў, што беларускія нацыяналісты па заданню Ю. Пілсудскага “спрабавалі стварыць “беларускае войска”, каб дапамагчы польскім панам захапіць і парабаціць Беларусь” [13, с. 101]. Менавіта палітычны фактар прывѐў да актывізацыі даследавання савецкімі гісторыкамі беларускага нацыянальнага руху і паўплываў на фарміраванне зместу гістарыяграфіі па гэтаму пытанню.

Савецкія гісторыкі разглядалі як адно цэлае ўвесь беларускі нацыянальны рух, не бачылі ў ім розныя плыні. Сярод беларускіх нацыянальных дзеячаў сапраўды існавала прапольская плынь, якая імкнулася ў барацьбе за беларускую дзяржаўнасць знайсці падтрымку ў Польшчы. Але меліся сілы, якія выступалі супраць супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. Г. В. Чычэрын у лютым 1920 г. адзначаў наяўнасць у беларускім нацыянальным руху антыпольскага напрамку і лічыў карысным, каб яно выступіла супраць прэтэнзій Польшчы на ролю пратэктара беларусаў [7, с. 29]. Урад Ластоўскага быў сфарміраваны антыпольскімі сіламі і характарызаваць яго як “польскую марыянетку” прадстаўляецца некарэктным. Улады РСФСР вясной-летам 1920 г. пайшлі на кантакты з гэтым урадам, разлічвалі выкарыстаць яго ў барацьбе супраць Польшчы [14]. Негатыўная пазіцыя Масквы ў адносінах да ўрада Ластоўскага сфарміравалася з пачаткам савецка- польскіх мірных перамоў, калі гэты ўрад выступіў з прэтэнзіяй на ўдзел у іх. Гэта магло ўскладніць дасягненне польска-савецкага пагаднення, у аснове якога ляжаў падзел Беларусі [7, с. 61].

Савецкія гісторыкі міжваеннага часу ў самых змрочных фарбах малююць польскі акупацыйны рэжым на Беларусі ў гады польска-савецкай вайны. М. Паўловіч адзначаў, што ва ўмовах польскай акупацыі сістэматычнаму праследаванню падвяргаюцца беларускія школы, якія пазбаўлены ўсялякіх сродкаў для існавання. З даследаванняў названага аўтара вынікае, што гэта частка больш шырокай палітыкі польскага ўрада, якая мае на ўвазе паланізацыю насельніцтва акупіраваных тэрыторый [15, с. 15, 37]. Шмат увагі рэпрэсіўнай палітыцы палякаў надаваў Д. Дудкоў, які прыводзіў велізарную колькасць фактаў аб тэроры акупацыйнай улады. Ён указваў, што палякі вярнулі маѐнткі польскім памешчыкам, а таксама “разгарнулі праграму самага жудаснага нацыянальнага прыгнѐту” [9, с. 116–117]. Савецкія гісторыкі рабілі акцэнт на класавым характары акупацыйнага рэжыму, які меў на мэце аднаўленне на акупіраванай частцы Беларусі “буржуазна-памешчыцкага ладу” [8, с. 24]. І. Ф. Лочмель асаблівую ўвагу звяртаў на нацыянальнае прыгнечанне, якое ажыццяўлялася палякамі на акупіраванай тэрыторыі, на палітыку паланізацыі [14, с. 100]. Як бачна, паступова мяняліся акцэнты савецкіх гісторыкаў пры ацэнцы польскай палітыкі на акупіраваных тэрыторыях. Калі ў 1920-я гг.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

асноўны націск рабіўся на сацыяльнае прыгнечанне, то ў другой палове 1930-х гг. на першы план выходзіць нацыянальны ўціск.

На думку савецкіх гісторыкаў, палітыка польскіх улад непазбежна параджала супраціўленне насельніцтва Беларусі акупантам, развіццѐ партызанскага руху. М. Паўловіч у выданні 1920 г. толькі адзначыў стварэнне беларускімі сялянамі партызанскіх атрадаў [15, с. 16]. В. К. Шчарбакоў у сваім даследаванні ў пачатку 1930-х гг. абмежаваўся толькі тэзісам аб значным росце партызанскага руху ў пачатку 1920 г. і прыводзіў шмат лічбаў, якія пацвярджаюць гэты тэзіс [12, с. 109]. Цікавую заўвагу па гэтай праблеме выказаў П. В. Суслаў, які адзначыў, што “аддзелы Чырвонай арміі з прахалодай адносіліся да добраахвотнікаў беларусаў і партызанскага руху”. У той жа час, ѐн падкрэслівае тую падтрымку, якую аказала Чырвонай Арміі насельніцтва Беларусі, хоць прызнаваў, што савецкім войскам прыходзілася часта забіраць у сялян самае неабходнае для іх самых [6, с. 123, 122].

У сярэдзіне 1930-х гг. інтарэс да партызанскага руху сярод гісторыкаў узрастае і асаблівы акцэнт робіцца на ролю бальшавіцкай партыі ў яго арганізацыі. Д. Дудкоў указваў, што буйныя атрады па 200–400 чалавек дзейнічалі па ўсѐй тэрыторыі Беларусі. У якасці буйнейшых цэнтраў партызанскага руху ім называюцца Бабруйскі і Мазырскі паветы [9, с. 125]. Ф. Папоў падкрэслівае значэнне пастановы ЦК кампартыі Літвы і Беларусі ад 14 мая 1919 г. аб стварэнні партызанскіх атрадаў для мабілізацыі насельніцтва Беларусі на барацьбу з польскай акупацыяй і прыводзіць дадзеныя аб значнай колькасці партызан [16, с. 55]. Масавы характар партызанскага руху нават у “некаторых польскіх этнічных раѐнах” адзначаў А. Матусевіч [17, с. 66]. Сучасная гістарыяграфія робіць выснову аб значным размаху парызанскага руху супраць польскай акупацыі на тэрыторыі Беларусі [18, с. 178].

Такім чынам, шэраг аспектаў беларускага пытання ва ўмовах польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. знайшлі адлюстраванне ў савецкай міжваеннай гістарыяграфіі. Аднак беларускае пытанне не вылучалася савецкімі даследчыкамі як самастойнае. Яно разглядалася ў кантэксце польскай экспансіі на ўсход, савецка-польскіх мірных перамоў, польскай палітыкі на акупіраваных тэрыторыях і супраціўлення гэтай палітыцы. Пэўную самастойнасць беларускае патанне для савецкіх даследчыкаў набыло толькі пры вывучэнні беларускага нацыянальнага руху. Неабходна адзначыць значны ўплыў на вывучэнне беларускага пытання савецкімі гісторыкамі міжваеннага часу палітычнага фактара.

### Спіс крыніц і літаратуры


1. Ленин, В.И. Наше внешнее и внутреннее положение и задачи партии. Речь на Московской губернской конференции РКП(б) 21 ноября 1920 года / В.И. Ленин // Полн. собр. соч.: в 55 т. Т. 42. – М. : Издат. полит. литерат., 1981. – С. 17–38.
2. Какурин, Н.Е. Война с белополяками 1920 г. / Н. Е. Какурин, В. А. Мельников. – М. : Государственное военное издательство, 1925. – 520 с.
3. Иоффе, Я. Организация интервенции и блокады советской республики 1918–1920. Очерк / Я. Иоффе. – М. – Л., Гос. издат. Отдел воен. лит., 1930. – 167 с.
4. Радек, К. Иосиф Пилсудский (Идеолог выступления) / К. Радек // Переворот в Польше и Пилсудский. – М. – Л. : Госуд. издат., 1926. – С. 5–19.
5. Радек, К. Война польских белогвардейцев против Советской России / К. Радек. – М. : Госиздат, 1920. – 24 с.
6. Суслов, П.В. Политическое обеспечение советско-польской кампании 1920 года / П.В. Суслов. – М. – Л. : Гос. издат. Отдел воен. лит., 1930. – 174 с.
7. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зборнік дакументаў і матэрыялаў: у 4 т. Т. 1. Ч. 2. – Мінск: «Юніпак», 2008. – С. 10–11.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

8. Лочмель, И.Ф. Освобождение Белоруссии вот белопольских оккупантов (11 июля 1920 г.) / И.Ф. Лочмель. – М. : Госиздат. Белоруссии, отдел политической литературы, 1939. – 53 с.
9. Дудкоў, Д. Контррэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм на службе белапольскіх акупантаў / Д. Дудкоў // Бальшавік Беларусі. – 1935. – № 10–11 – С. 113–129.
10. Мархлевский, Ю. Война и мир между буржуазной Польшей и пролетарской Россией / Ю. Мархлевский. – М. : Госуд. издат., 1921. – 43 с.
11. Жалуновіч, З. Нацыянал-дэмакраты за работай (1920–1928 гг.) / З. Жалуновіч // Спадчына. – 1991. – № 5 – С. 62–75.
12. Шчарбакоў, В.К. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і польская акупацыя / В.К. Шчарбакоў. – Мінск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930. – 127 с.
13. Лочмель, И.Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И.Ф. Лочмель. – М. : Воениздат, 1940. – 163 с.
14. Лазько, Р. Беларуска-савецкія перагаворы 1920 г. / Р. Лазько // Białoruś w XX stuletiu w kręgu kultury i polityki. – Toruń: Wydawnictwo naukowe UNK, 2007. – S. 325–337.
15. Павлович, М. Война с польскими панами (Польско-шляхетская авантюра) / М. Павлович. – М. : Типография III Интернационала, 1920. – 32 с.
16. Папоў, Ф. Барацьба беларускага народа з белапольскімі акупантамі / Ф. Папоў // Бальшавік Беларусі. – 1940. – № 6 – С. 42–59.
17. Матусевич, А. Исторические предпосылки краха Польши / А. Матусевич // Исторический журнал. – 1939. – № 11. – С. 58–69.
18. Грицкевич, А.П. Западный фронт РСФСР 1918–1920 / А.П. Грицкевич. – Минск: Харвест, 2010. – 496 с.

**Mikalai Miazga. Belarusian matters during the Polish-Soviet War of 1919-1920 as described in Soviet and Polish Interwar historiography.** The article explains the content of the Soviet Interwar historiography, that studied Belarusian matters related to the Polish-Soviet War of 1919-1920. Also it states and describes various concepts that were developed by the researchers who were working on this problem.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ